


**ВКЛ** (поўная назва Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае), у склад якога ўваходзілі тэрыторыі сучасных Беларусі і Літвы, часткова Украіны, Расіі і Латвіі, праіснавала з 1235 да 1569 года як самастойная дзяржава, а з 1569 па 1795 год - у уніі з Польшчай.
У часы росквіту ВКЛ яго тэрыторыі распасціраліся ад берагоў Балтыйскага мора да берагоў Чорнага. Княства было адной з самых вялікіх дзяржаў у Еўропе.

Падчас існавання ВКЛ жыло і дзейнічала шмат выбітных асобаў, некаторых з іх вы знойдзеце на картах дадзенай калоды.




♥ МІНДОЎГ ♥
(~1195 — 1263)

**Міндоўг** — першы вялікі князь літоўскі (1236 — 1263), першы і апошні кароль літоўскі (1253 — 1261). Легендарная постаць беларускай гісторыі. Быў таленавітым палкаводцам, дзякуючы чаму далучыў да Навагрудка іншыя землі і стварыў Вялікае княства. Хрышчэнне Міндоўга забяспечвала княству мір з Лівонскім ордэнам і на дзесяцігоддзі Літва ўвайшла ў палітычную сістэму каталіцкай Еўропы.




♥ МАРТА ♥
(~1210 — 1263)

**Марта** — вялікая княгіня літоўская, жонка літоўскага караля Міндоўга. У 1251 годзе Марта і яе муж Міндоўг прынялі каталіцкую веру. Каралева-кансорт Літвы. Была мудрай жанчынай, кансультавала свайго мужа адносна палітычных пытанняў.




♥ ВОЙШАЛК ♥
(ЛАЎРЫШ)
(1223 — 1267)

**Войшалк** — вялікі князь літоўскі (1264 — 1267), сын Міндоўга. Пашырыў тэрыторыю княства за кошт уключэння Усходняй Балтыкі. Прыняў пострыг у манахі. Больш за тое, заснаваў пад Навагрудкам манастыр, які сёння вядомы як Лаўрышаўскі. Адзін з нямногіх кіраўнікоў у гісторыі Беларусі, які сам адышоў ад улады.




♣ ГЕДЫМІН ♣
(~1275 — 1341)

**Гедымін** — вялікі князь літоўскі (1316 — 1341), Павялічыў тэрыторыю княства ўдвая, праводзіў мудрую ўнутраную і знешнюю палітыку, супрацьстаяў крыжацкай і татарскай агрэсіі. Гедымін заклаў мураваны замак у Вільні, куды пазней перанёс сталіцу княства. Мураваныя замкі з'явіліся таксама ў Медніках, Лідзе, Крэве, Віцебску. Пры Гедыміне актывізаваліся кантакты з Заходняй Еўропай і быў пакладзены падмурак рускаму вектару палітыкі ВКЛ. Яго шматлікія нашчадкі ўтварылі дынастыю Гедымінавічаў.




♣ АЛЬДОНА ♣
(ГАННА)
(~1310 — 1339)

**Альдона** — дачка вялікага князя літоўскага Гедыміна. У 1325 годзе Альдона прыняла хрышчэнне і выйшла замуж за польскага каралевіча Казіміра, які ў 1333 г. стаў каралём. Шлюб замацаваў саюз ВКЛ і Польшчы, накіраваны супраць Тэўтонскага ордэна. Гэта быў першы дынастычны шлюб паміж ВКЛ і Польшчай, які садзейнічаў збліжэнню паміж дзяржавамі.




♣ ДАВЫД ♣
ГАРАДЗЕНСКІ
(? — 1326)

**Давыд Гарадзенскі** — староста гарадзенскі, военачальнік Гедыміна. Легендарны герой вайны з Тэўтонскім ордэнам, абаронца Гародні, Наваградка і Пскова. Вялікі князь Віцень, а пасля яго наступнік Гедымін пасылалі Давыда туды, дзе было асабліва цяжка, дзе патрабаваліся не толькі мужнасць і геройства, але і талент палкаводца. Паводле меркаванняў некаторых даследчыкаў, мог быць пахаваны ў Гародні каля Барысаглебскай царквы.



**♠ ВІТАЎТ ♠**
(1392 — 1430)

**Вітаўт** — вялікі князь літоўскі (1392 — 1430). Адзін з найбольш вядомых кіраўнікоў Вялікага Княства Літоўскага, яшчэ пры жыцці празваны Вялікім. Вітаўт правіў ВКЛ амаль 40 гадоў. Пры ім Вялікае Княства Літоўскае дасягнула найвялікшага росквіту, было адной з буйнейшых дзяржаў у Еўропе. У "Песні пра зубра" 1523 года ён паўстае легендарным князем "залатога стагоддзя", узорам кіраўніка.



**♠ АНАСТАСІЯ ♠ СЛУЦКАЯ**
(кан. XV — 1-я пал. XVI)

**Анастасія Слуцкая** — жонка слуцкага князя Сямёна Алелькавіча, "беларуская Жанна д'Арк". Пасля смерці мужа ўзначаліла абарону Слуцка ад татараў хана Баты-Гірэя. Пасля адбітага штурму войска Баты-Гірэя было разбіта ўшчэнт.



**♠ КАНСТАНЦІН ♠ АСТРОЖСКІ**
(1460 — 1530)

**Канстанцін Астрожскі** — вядомы палкаводзец з праваслаўнага княжаскага роду Астрожскіх, вялікі гетман літоўскі. Праславіўся перамогамі над татарамі. За сваё жыццё Канстанцін Астрожскі перамог у 63 бітвах. Самай вядомай перамогай палкаводца стала бітва пад Оршай, дзе ён разбіў войска Маскоўскага княства, якое пераўзыходзіла па колькасці яго ўласнае войска амаль у 2,5 разы.



**♦ ЖЫГІМОНТ ♦ АЎГУСТ**
(1520 — 1572)

**Жыгімонт II Аўгуст** — вялікі князь літоўскі (1544 — 1572), кароль польскі (1548 — 1572). Падчас яго праўлення пашырылася рэфармацыя розных плыняў. Праводзіў палітыку талерантнасці ў адносінах да ўсіх канфесій. Быў мецэнатам, падтрымліваў людзей мастацтва. Пры ім заключаная Люблінская унія, па якой Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае аб'ядноўваліся ў федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую. З'яўляецца апошнім каралём польскім і вялікім князем літоўскім, які атрымаў карону ў спадчыну, а не будучы абраным.



**♦ БАРБАРА ♦ РАДЗІВІЛ**
(1520 — 1551)

**Барбара Радзівіл** — жонка Жыгімонта II Аўгуста, паходзіла са знакамітага шляхецкага роду Радзівілаў. Жыгімонт таемна абвянчаўся з Барбарай ў 1547 годзе, бо не мог атрымаць дазвол на шлюб. Неўзабаве пасля гэтага маладая каралева захварэла і памерла. Існуе гіпотэза, што яна была атручаная Бонай Сфорцай, маці караля.  Барбара Радзівіл стала гераіняй многіх легенд, у якіх выступае ў вобразе Чорнай дамы, а гісторыі рамантычнага кахання Барбары і Жыгімонта прысвечаны шматлікія мастацкія творы.



**♦ ФРАНЦЫСК ♦ СКАРЫНА**
(1470 — ~1551)

**Францыск Скарына** — ўсходнеславянскі асветнік і навукоўца, дзейнасць якога звязана з творчасцю, медыцынай і моваздаўствам. Ён увайшоў у гісторыю як беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, а таксама як філосаф, чый светапогляд спалучаў хрысціянскія, антычныя і гуманістычныя ідэі. Адзін з найвялікшых прадстаўнікоў Беларусі таго часу, пакінуў пасля сябе помнік літаратуры ў выглядзе Бібліі, перакладзенай з царкоўнаславянскай на старабеларускую мову. У цяперашні час яго асоба  шануецца многімі славянскімі народамі.


**НАД ГУЛЬНЁЙ ПРАЦАВАЛІ:**

**Антон Янкоўскі** - кіраўнік праекту
**Наста Янкоўская** - мастак
**Таццяна і Дзяніс Язерскія** - гісторыкі
**Дзяніс Вашкевіч** - рэдактар

А•ЧАТЫРЫ творчая студыя
a4games.by
a4gamesby
kramakubik

OZ
Прыносіць радасць :)
@myozby
@myozby
@myozby